ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ СІСТЭМА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК Г. МІНСКА

СЕКТАР ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РАБОТЫ

# *Да 120-годдзя з дня нараджэння Адама Русака*



*бібліяграфічны спіс*

Мінск 2024

**Мой сябра**

*З ім я ў працы, адпачынку,*
*на ўроку, перапынку.*
*З ім я ў полі, з ім у школе,*
*з ім не сумна мне ніколі.*
*З ім вандрую я па свеце,*
*з ім лятаю ў ракеце.*
*Чаго сам не адгадаю,*
*у яго я запытаю.*
*З ім я гутарку вяду,*
*з ім нідзе не прападу.*
*— Хто ж ён гэтакі, скажы?*
*Нам яго ты пакажы.*
*— Нездагадлівы ты, Мішка…*
*Сябра мой, вось бачыш, — кніжка.*

*А. Русак*

## Прадмова

Нарадзіўся А. Русак у в. Пясочнае Ігуменскага павета Мінскай губерніі (цяпер Капыльскі раён Мінскай вобласці) у сялянскай сям'і. Яго бацька добра іграў на скрыпцы, стварыў у вёсцы невялікі аматарскі аркестр, дзе А. Русак атрымаў першыя ўрокі музыкі. Пасля заканчэння ў 1914 г. Пясочанскай пачатковай школы ён некаторы час працаваў на гаспадарцы. У 1922 г. паступіў у Мінскі будаўнічы тэхнікум, аднак пакінуў яго і ў 1925 г. стаў студэнтам музычнага тэхнікума, які адкрыўся ў Мінску. У час вучобы іграў у сімфанічным аркестры Беларускага радыё, два гады (1928—1930) служыў у Чырвонай арміі (быў музыкантам вайсковага аркестра). У 1930 г. А. Русак скончыў тэхнікум і паступіў у Ленінградскую кансерваторыю (клас прафесара М. Буяноўскага). Адначасова, з 1932 г. і пасля заканчэння кансерваторыі (1934), працаваў у аркестры Ленінградскага Малога opернага тэатра. У гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў эвакуацыі ў Арэнбургу. У 1949 г. яго запрасілі ў сімфанічны аркестр Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Вершы А. Русак пачаў пісаць яшчэ ў Пясочным. 27 мая 1927 г. у часопісе «Чырвоны сейбіт» быў апублікаваны яго першы твор «Мая песня». Больш рэгулярна друкаваўся з 1932 г. (у часопісах «Заклік», «Полымя рэвалюцыі», газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва»). У 1940 г. быў падрыхтаваны зборнік «На родных палетках» (выдадзены ў 1946 г.). Потым з'явіліся кнігі «Песні і вершы» (1951), «Песні» (1954), «Пад голас баяна» (1957), «Звонкія крыніцы» (1965), «Закрасуйся, Нёман» (1978) і інш. Ёсць у паэта і творы для дзяцей, якія ўвайшлі ў зборнік «У Буслаўцы» (1967), «Добра ведаю ўрок» (1981), «Дружбакі» (1987). Прывабнасць паэзіі А. Русака ў яе напеўнасці, музычнасці, лірызме, арганічнай сувязі з фальклорам. Асабліва ярка гэта выяўляецца ў вершах «Чырвоная вяргінечка», «Вясельная», «Зімовы вечар», «Крынічанька», «Як правёў мяне Цімох» і інш. Глыбінёй і шчырасцю кранае любоўная лірыка А. Русака (вершы «Толькі з табою», «Дзе ты, зорка мая...», «Ціхі вечар», «Сярожка» і інш.). Шмат твораў прысвяціў паэт роднаму краю, сваім землякам, Радзіме і яе абаронцам у час Вялікай Айчыннай вайны («Мой край», «Веснавыя плыні», «Жніўная песня», «Закрасуйся, Нёман», «Мяцеліца», «Люблю лугі квяцістыя», «На Прыпяці», «Прыляцелі гусі», «Купчастая вішня», «Край палескі». «Лясная песня» і інш.).

Бібліяграфічны спіс "Адам Русак. Да 120-годдзя з дня нараджэння" пазнаёміць з матэрыяламі аб жыцці і творчасці паэта, якія знаходзяцца ў фондах дзяржаўнай установы "Цэнтралізаваная сістэма публічных бібліятэк г. Мінска". Паказальнік змяшчае кнігі, артыкулы з перыядычных выданняў, мае тры раздзелы: "Творы А. Г. Русака", Творы А. Г.

Русака ў зборніках", "Жыццёвы і творчы шлях паэта". Размяшчэнне матэрыяла: кнігі — у алфавіце, артыкулы — у зваротна-храналагічным парадку. Бібліяграфічны паказальнік будзе карысны ўсім, хто цікавіцца беларускай літаратурай і творчасцю паэта.

Змест
Творы А. Г. Русака
Творы А. Г. Русака ў зборніках
Жыццёвы і творчы шлях паэта

## Творы А. Г. Русака

**Беларусь — мая Радзіма** : вершы. Апавяданні. Нарысы : [творы беларускіх паэтаў і празаікаў]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 134, [1] с.
*Верш А. Русака "Мой край" на с. 96.*

**Верасок :** чытанка : [для дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту / укладальнік І. Фралова ; мастак Л. Жванія. — Мінск : Звязда, 2023. — 206, [1] с.
*Верш А. Русака "Лясная песня" на с. 100.*

**Жывое слова** : творы для пазакласнага чытання ў 2-м і 3-м класах / [укладальніца А. Спрынчан]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2022. — 299, [11] с.
*Верш А. Русака "Мой сябра" на с. 29.*

**Пад небам высокім Радзімы** : паэзія : [прысвечана 30-годдзю святкавання Дня беларускага пісьменства / укладанне В. Шніпа ; фотаздымкі К. Дробава і Я. Пясецкага]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 133, [1] с.
*Верш А. Русака на с. 13.*

**Русак, А.** Мой сябра : вершы : [для малодшага школьнага ўзросту] / Адам Русак. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 21, [3] с. — (Жывая класіка дзецям).

**Хітры дзённік** : творы пра школу : [для малодшага школьнага ўзросту] / укладальніца Аксана Спрынчан]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 341, [1] с.
*Верш А. Русака "Мой сябра" на с. 189.*

## Творы А. Г. Русака ў зборніках

**Цудадзейны карагод :** зборнік твораў для пазакласнага чытання ў 3 класе : у 2 ч. / [укладальнік І. Г. Волкава]. — Мінск : Народная асвета. — Ч. 2. — 2018. — 303 с.
*Верш А. Русака "Сінічка" на с. 33—34.*

*змест*

## Жыццёвы і творчы шлях паэта

**Русак, Адам Герасімавіч** // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : [у 12 т.] / рэдкалегія: П. У. Броўка (галоўны рэадактар) [і інш.]. — Мінск, 1973. — Т. 9. — С. 183.

**Русак, Адам Герасімавіч** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / [пад рэдакцыяй прафесара А. В. Мальдзіса]. — Мінск, 1995. — Т. 5. — С. 172—176.

**Русак, Адам Герасімавіч** // Беларускія пісьменнікі (1917—1990) : даведнік / [складальнік А. К. Гардзіцкі ; навуковы рэдактар А. Л. Верабей]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. — С. 468.

**Русак, Адам Герасімавіч** // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : [у 2 т.] / [рэдкалегія: Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) і інш.]. — Мінск, 2006. — Т. 2. — С. 445.

**Русак, Адам Герасімавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкалегія: Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 2001. — Т. 13. — С. 454.

**Русак, Адам Герасімавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя: [у 6 т.] / рэдкалегія: У. У. Андрыевіч (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 2015. — Т 6. — С. 293.

**Русак Адам Герасимович** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / [редколлегия: В. В. Андриевич (главный редактор) и др.]. — Минск, 2019. — Т. 5: в 3 кн., кн. 3. — С. 135.

**Русак, Адам Герасімавіч** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкалегія: І. П. Шамякін (галоўны рэдактар) і інш. — Мінск, 1987. — Т. 4. — С. 529—530.

*****

**24 мая — 120 год з дня нараджэння А. Г. Русака (1904—1987), паэта, заслужанага дзеяча культуры Беларусі** // Новыя кнігі. Па старонках беларускага друку. Даты беларускага календара (май—чэрвень). — 2024. — № 2. — С. 4—5.

*Аб жыцці і творчасці А. Г. Русака.*

**Свистунова, О. В.** М. Багдановіч "Перад паводкай", А. Русак "Мама" : Літаратурнае чытанне. 3 клас / Свистунова Оксана Викторовна // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя "У дапамогу педагогу". — 2023. — № 7. — С. 38—43.

*Метадычныя матэрыялы да ўрока ў 3 класе з выкарыстаннем аўдыязапісу верша "Мама" А. Русака.*

**Купчанка, Т.** Жыццё, пражытае па законах песні. Адам Русак : музычная вечарына / Т. Купчанка // Бібліятэка прапануе. — 2019. — № 9. — С. 10—14.

*Сцэнарый да музычнай вечарыны.*

**Бароўская, І. А.** "Дзе ты, зорка мая, непагасная?.." : да 110-годдзя з дня нараджэння Адама Русака / Ірына Бароўская // Роднае слова. — 2014. — № 5. — С. 77—80.

**Макарэвіч, В.** Падданы яе вялікасці песні / Васіль Макарэвіч // Полымя. — 2014. — № 5. — С. 148—153.

*Літаратурная творчасць паэта-песенніка А. Г. Русака.*

***змест***